# ФАКТЫ І ЛІЧБЫ ПРА АДНОСІНЫ ЕС І БЕЛАРУСІ

За апошнія чатыры гады **супрацоўніцтва паміж ЕС і Беларуссю ўзмацнілася**. Дапамога для Беларусі з боку ЕС падвоілася і складае каля 30 мільёнаў еўра ў год. 8 студзеня 2020 года былі падпісаныя **пагадненні аб спрашчэнні візавага рэжыму і рэадмісіі**. Чакаецца, што яны ўступяць у сілу з 1 ліпеня 2020 года. Беларусь актыўна ўдзельнічае ў шматбаковым фармаце Усходняга партнёрства. Двухбаковыя адносіны будуць умацоўвацца праз **Прыярытэты партнёрства ЕС–Беларусь**, якія ў цяперашні час абмяркоўваюцца. Яны дазволяць усталяваць стратэгічныя рамкі для супрацоўніцтва ў бліжэйшыя гады. Заўважныя крокі, зробленыя Беларуссю ў сферы павагі ўніверсальных свабод, вяршэнства права, правоў чалавека, у тым ліку свабоды слова, выказвання і СМІ, а таксама працоўных правоў, застануцца асноватворнымі крытэрыямі пры фармаванні палітыкі ЕС у дачыненні да Беларусі. ЕС працягвае аказваць падтрымку Беларусі на шляху ўступлення ў Сусветную гандлёвую арганізацыю, паколькі гэта будзе спрыяць стварэнню **больш прадказальнага і стабільнага бізнес-асяроддзя ў краіне**.

## ЭКАНОМІКА

✓ З 2016 года імкліва пашыраецца супрацоўніцтва з **міжнароднымі фінансавымі інстытутамі**, такімі як Еўрапейскі інвестыцыйны банк (ЕІБ) і Еўрапейскі банк рэканструкцыі і развіцця (ЕБРР), што павялічвае даступнасць фінансаў для прыватнага сектара і падтрымкі малых і сярэдніх прадпрыемстваў, фінансавання шэрагу буйнамаштабных інфраструктурных праектаў, у прыватнасці ў рамках **пашырэння транспартнай сеткі TEN-T**, а таксама ў галіне барацьбы са **змяненнем клімату**.

✓ У рамках ініцыятывы EU4Business ЕС забяспечыў падтрымку **4500 беларускіх кампаній** праз фінансаванне, навучанне, садзейнічанне экспарту на новыя рынкі. Праз стымуляванне да росту малых і сярэдніх прадпрыемстваў было створана **5700 новых працоўных месцаў**.

✓ ЕС узмацніў падтрымку **Брэсцкай і Гродзенскай** вобласці, надаючы асаблівую ўвагу рэсурснай і энергетычнай эфектыўнасці.

✓ ЕС працягвае падтрымліваць Беларусь у працэсе ўступлення ў Сусветную гандлёвую арганізацыю (СГА).

✓ Вядуцца **двухбаковыя дыялогі** па эканамічных і фінансавых пытаннях, а таксама пытаннях гандлю і мытнага супрацоўніцтва.

## НАВАКОЛЬНАЕ АСЯРОДДЗЕ І ЎЗАЕМАСУВЯЗЬ

✓ Праз мэтавы **Фонд для ўсходнееўрапейскага партнёрства па энергаэфектыўнасці і навакольным асяроддзі**, які адмініструецца ЕБРР, Беларусь мае доступ да 10 мільёнаў еўра для ключавых праектаў у галіне энергаэфектыўнасці і аховы навакольнага асяроддзя. Першы **праект па цвёрдых адходах у Пухавічах** дазволіў прыцягнуць інвестыцыі ў памеры 7 мільёнаў еўра. У канцы 2019 года быў зацверджаны новы інвестыцыйны грант на будаўніцтва водаачышчальных збудаванняў у шасці гарадах Беларусі.

✓ Падтрымка ЕС паспрыяла **павышэнню энергаэфектыўнасці адукацыйных устаноў** у інтарэсах **2 000 дзяцей школьнага і дашкольнага ўзросту**, а падтрымка для мадэрнізацыі дазволіла палепшыць умовы жыцця 10 000 грамадзян і скараціць выдаткі на электраэнергію ў 10 адміністрацыйных адзінках.

✓ У адпаведнасці з Прыкладным інвестыцыйным планам для TEN-T паляпшэнне **890 км. аўтамабільных дарог і 200 км. чыгункі** дазволяць **удасканаліць сувязь**, павысіць бяспеку дарожнага руху і палепшыць выкарыстанне інтэлектуальных транспартных сістэм. Першыя работы па рэканструкцыі трасы М7 (Мінск — мяжа Літвы) пачнуцца ў 2020 годзе.

✓ Праз **Праграму паляпшэння якасці паветра і кіравання навакольным асяроддзем** падтрымліваюцца намаганні Беларусі па мадэрнізацыі кантролю за якасцю паветра, што спрыяе больш чыстаму паветру ў Беларусі.

✓ Штогод праводзіцца двухбаковы дыялог **па пытаннях навакольнага асяроддзя і клімату**.

## КІРАВАННЕ

✓ Два разы на год на ўзроўні высокіх службовых асоб збіраецца **Каардынацыйная група ЕС-Беларусь**. Група ажыццяўляе агульнае кіраванне супрацоўніцтвам паміж ЕС і Беларуссю і сочыць за далейшым развіццём адносін.

✓ Штогадовы **дыялог па правах чалавека паміж ЕС і Беларуссю** з'яўляецца пляцоўкай для абмеркавання сітуацыі з правамі чалавека ў Беларусі і сумесных крокаў у гэтай сферы. **ЕС па-ранейшаму застаецца адкрытым для супрацоўніцтва з Беларуссю дзеля ўмацавання дэмакратычных прынцыпаў кіравання**.

✓ У сваіх дачыненнях з беларускімі ўладамі на ўсіх узроўнях ЕС рэгулярна ўздымае пытанні, звязаныя са свабодай сходаў і асацыяцый, свабодай слова і СМІ, а таксама асноватворнымі працоўнымі правамі. ЕС рэзка выступае супраць смяротнага пакарання, якое да гэтага часу прымяняецца ў Беларусі, і заклікае ўвесці мараторый на смяротнае пакаранне.

✓ ЕС падтрымліваў рэалізацыю **Нацыянальнага плана дзеянняў у галіне правоў чалавека** на перыяд 2016-2019 гг. і заахвочваў дыялог паміж уладамі і грамадзянскай супольнасцю. За перыяд з 2014 па 2018 год ЕС выдзеліў 30 мільёнаў еўра на падтрымку сацыяльнага прадпрымальніцтва, умацаванне патэнцыялу грамадзянскай супольнасці і пашырэнне яе ўдзелу ў працэсах прыняцця рашэнняў, павышэнне якасці прафесійнай справаздачнасці і ўмацаванне патэнцыялу работнікаў незалежных сродкаў масавай інфармацыі.

✓ З 2016 года новым напрамкам пажаданай формы супрацоўніцтва паміж ЕС і Беларуссю сталі праекты двухбаковага супрацоўніцтва. У Беларусі сем такіх твінінг-праектаў, якія прадугледжваюць абмен досведам прадстаўнікоў адпаведных інстытутаў дзяржаўнага сектара з краіны ЕС і краіны-бенефіцыяра.

## ГРАМАДСТВА

✓ 8 студзеня 2020 года з Беларуссю былі **падпісаныя пагадненні аб спрашчэнні візавага рэжыму і рэадмісіі**. Чакаецца, што яны ўступяць у сілу з 1 ліпеня 2020 года. З 2016 года ажыццяўляецца супрацоўніцтва ў рамках Партнёрства па мабільнасці. У 2018 і 2019 гадах пачалося некалькі праектаў супрацоўніцтва ў галіне пагранічнага і міграцыйнага кіравання, накіраваных на павышэнне патэнцыялу Беларусі і ўмацаванне **трансгранічнага супрацоўніцтва** ў гэтай галіне.

✓ У рамках праграмы Erasmus+ з 2009 года паміж Беларуссю і ЕС адбылося больш за **3 000 студэнцкіх** і выкладчыцкіх абменаў. З 2014 года больш за **3 400 прадстаўнікоў моладзі** і моладзевых работнікаў з Беларусі бралі ўдзел у абменах, навучанні і валанцёрскіх праектах у ЕС.

✓ Праз **Праграму мабільнасці для мэтавых кантактаў паміж людзьмі** (MOST) больш за **5 500 беларусаў** скарысталіся **магчымасцямі кароткатэрміновых прафесійных абменаў** у ЕС у галіне культуры, адукацыі, аховы здароўя, навукі, тэхналогій, інавацый і прадпрымальніцтва, набываючы навыкі, веды і ўсталёўваючы прафесійныя кантакты з калегамі ў краінах-членах ЕС

✓ Беларусь прыняла ўдзел у 48 праектах у рамках праграмы «Гарызонт 2020», накіраваных на ўмацаванне **навукова-інавацыйнага** патэнцыялу.

# ЕС ПАДТРЫМЛІВАЕ БЕЛАРУСЬ ПАДЧАС ПАНДЭМІІ COVID-19

ЕС хутка адрэагаваў на неадкладныя патрэбы краін Усходняга партнёрства падчас пандэміі COVID-19. Праз Групу Еўропа (Team Europe) ЕС мабілізаваў амбіцыйны пакет падтрымкі на агульную суму больш **980 мільёнаў еўра**. Гэта дапаможа з неадкладнымі патрэбамі, такімі, як падтрымка сферы аховы здароўя і ўразлівых груп. Пакет таксама разлічаны на кароткачасовыя патрэбы, звязаныя з аднаўленнем эканомікі і грамадства ў шасці краінах.

У рамках гэтага, для Беларусі сабраны спецыяльны пакет падтрымкі ў рэагаванні на COVID-19 памерам **60 мільёнаў еўра**. Сродкі мабілізаваныя з існуючых і новых фондаў і прызначаюцца для аказання канкрэтнай падтрымкі насельніцтву.

√ **ПАДТРЫМКА СЕКТАРА АХОВЫ ЗДАРОЎЯ І НЕАДКЛАДНЫЯ ПАТРЭБЫ:**

- Праца з СААЗ па пастаўцы медыцынскага абсталявання, набораў для правядзення тэстаў, масак, ахоўных акуляраў, касцюмаў, халатаў і інш. Падрыхтоўка медыцынскага і лабараторнага персаналу.
- Дзякуючы праграме ЕС па трансгранічным супрацоўніцтве «Польшча-Беларусь-Украіна» Еўрапейскі саюз дапамагае беларускай службе хуткай медыцынскай дапамогі лепш рэагаваць на надзвычайныя сітуацыі.

√ **ПАДТРЫМКА ГРАМАДЗЯНСКАЙ СУПОЛЬНАСЦІ:**

- Экстранныя гранты на падтрымку ўразлівых груп, пажылых і дзяцей.

√ **ПАДТРЫМКА МСП І МАЛЫХ ФЕРМЕРСКІХ ГАСПАДАРАК:**

- Дзякуючы ініцыятыве **EU4Business** МСП і самазанятыя асобы, каб супрацьстаяць крызісу, могуць атрымаць гранты, крэдыты і кансультацыі па развіцці бізнесу.

√ **ПАДТРЫМКА САЦЫЯЛЬНА-ЭКАНАМІЧНАЙ УСТОЙЛІВАСЦІ:**

- ЕС будзе дапамагаць дзяржаўным органам Беларусі забяспечваць сістэму аховы здароўя ўсім неабходным для барацьбы з успышкай COVID-19 і падобнымі ўспышкамі ў будучым; забяспечваць доступ беларусаў да сацыяльнай падтрымкі, каб пераадолець негатыўныя наступствы COVID-19; а таксама падтрымліваць эканамічнае аднаўленне прадпрыемстваў.

## АКЦЭНТЫ:

### што ўжо зроблена

У школы перадалі **15 000** **буклетаў** і **2 000** **плакатаў** па прафілактыцы COVID-19.

**24** **школы** атрымалі **1 300** **літраў вадкасці** для дэзынфекцыі, каб вучні вучыліся ў бяспечных умовах.

Пастаўленыя **сродкі індывідуальнай абароны** для бяспекі валанцёраў і медыкаў.

У **грамадскім транспарце** распаўсюджана **145 000** лістовак з парадамі, праведзеныя трэнінгі па камп'ютарных навыках для пажылых людзей з вёсак, каб яны маглі заставацца на сувязі падчас пандэміі COVID-19.

Дзякуючы фінансаванню Erasmus + лабараторыя FABLAB выробляе **ахоўныя экранныя маскі** для медыцынскіх работнікаў і дэталі для апаратаў штучнай вентыляцыі лёгкіх.

## У ЛІЧБАХ

**ЕС з'яўляецца другім гандлёвым партнёрам Беларусі**, на долю якога прыпадае амаль чвэрць агульнага тавараабароту краіны. У 2018 годзе ў параўнанні з папярэднім годам гандаль паміж ЕС і Беларуссю павялічыўся на

**16%**

У 2014-2020 гг **дапамога Беларусі з боку ЕС** у рамках Еўрапейскага інструмента суседства склала

**170 мільёнаў еўра**

Больш за

**5500**

**беларусаў** скарысталіся магчымасцямі **кароткатэрміновых прафесійных абменаў** праз Праграму мабільнасці для мэтавых кантактаў паміж людзьмі (MOST).

З 2016 года ЕІБ выдзеліў

**530 мільёнаў еўра**

на падтрымку прыватнага сектара, малых і сярэдніх прадпрыемстваў, ключавых інфраструктурных і кліматычных праектаў.

## ЯДЗЕРНАЯ БЯСПЕКА

**Захаванне высокіх стандартаў ядзернай бяспекі з'яўляецца ключавым прыярытэтам для ЕС**, тым больш, што АЭС у Беларусі будуецца так блізка да межаў ЕС (у Астраўцы). Ядзерная бяспека за яго ўласнымі межам мае для ЕС важнае значэнне, таму ЕС заклікае Беларусь працягваць канструктыўнае супрацоўніцтва з адпаведнымі міжнароднымі органамі.

## ЗМЯКЧЭННЕ НАСТУПСТВАЎ ЗМЕНЫ КЛІМАТУ

За апошнія гады ў Беларусі падвоілася колькасць мясцовых органаў улады, якія далучыліся да ініцыятывы **«Пагадненне мэраў»** — асноўнага еўрапейскага руху для ўдзелу мясцовых органаў улады ў рэалізацыі палітыкі ўстойлівага развіцця энергетыкі. Колькасць падпісантаў дасягнула 52-х. Гэта паказвае высокі інтарэс, матывацыю і магчымасці для дзеяння **па змяншэнні выкідаў $CO_2$ і эканоміі энергіі ў Беларусі на мясцовым узроўні**.

## ТРАНСГРАНІЧНАЕ СУПРАЦОЎНІЦТВА

У Беларусі рэалізуецца **дзве праграмы трансгранічнага супрацоўніцтва**: «Латвія-Літва-Беларусь» і «Польшча-Беларусь-Украіна». Гэтыя праграмы спрыяюць эканамічнаму і сацыяльнаму развіццю прыгранічных раёнаў і ствараюць магчымасці для пашырэння кантактаў паміж людзьмі.

EaP | Eastern Partnership